ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1992
КРАСАВІК
6
Панядзелак

№ 65 (250)
Цана 30 кап.

ПЕРШАЯ КАЛОНКА

У РАЛЛІ АГРЭХ— У КІШЭНІ ПРАРЭХ

ПАЛЯЎНІЧЫ СЛАВІЦЦА МЕТКАСЦЮ, ДЗЯЎЧЫНА—ПРЫГАЖОСЦЮ, ЖАНЧЫНА—ГАСПАДАРЛІВАСЦЮ, А НАШ УРАД!

ФРАНЦУЗЫ гавораць: «Час падобны прыгожай жанчыне—ён не любіць чакаць». І не верыць гэтаму быццам бы няма падстаў: у жанчынах толк яны ведаюць—нездарма ж заўсёды абапіраюцца на даўно высветленую ісціну: «Шэрэ ла фам». Дый, здаецца, ні перабудоўваць, ні пераходзіць нікуды ім не трэба—паспяваюць. Мы ж, зацюканыя і здзічэлыя, у вечным пошуку, у настырных праблемах, нават пры ўспамінаем в Сакавіка, ды пры пераходзе іх з зімовай на летне-пляжную форму адзення. «Як душы твaёй пакутнай, з-пад магільнай пліты гоман веча ў гуслях чутны, чутны звон разбіты...» Бы пра нас сказаў Купала.

Ды хто сёння слухае іншых? Цяпер модна мець сваю, асабістую думку, за якую нічога не будзе—ні табе, ні іншым. Яе добра выказаць, абляць астатніх і застацца пры ёй. «А Васька слухае ды есць». Яшчэ лепш рабіць выгляд, што неогул нічога вакол не адбываецца, і рабіць свае справы. Ці, наадварот, паказваць добрае разуменне праблем, што навокал, і таксама рабіць толькі свае справы. Галоўнае потым з разумным выглядам сказаць: «Мы гэта прадбачылі; так, як і падказвалі разлікі». Або: «Мы самі былі пастаўлены перад фактам, для нас саміх—гэта нечаканасць». Абодва варыянты праходзяць у залежнасці ад сітуацыі, аўдыторыі, месца знаходжання. Прыклады? Яны ў нас перад вачамі—у газетах, па тэлебачанні.

Але ўсе гэтыя рэмінісцэнцыі з адной нагоды—угодак «паўлава дня». Здаецца, зусім нядаўна «выйшаў вожык з тумана», а ўжо год прайшоў. Былы прэм'ер падлічвае колькасць калорый у турэмнай баландзе «Матроскай цішыні», а люд па-ранейшаму ўздрыгвае пры набліжэнні пачатку наступнага месяца, квартала, збівае ногі ў пошуках крупы, цукру, масла... Калі што і дабавілася, дык гэта стосы купонаў ды колькасць нулёў у таварных цэнніках. Праўда, у Расіі цяпер напередзе Гайдар. Вось ён, дарэчы, і дэманструе, што ўсё адбываецца як мае быць, што так і трэба, і за льсціваю ўсмешкаю робіць свае справы. Наша паважанае спадарства (былыя таварышы) усё на месцы. І, падцягнуўшы некаторых сваіх, каго да Дому ўрада, каго да былога будынка былой кіруючай і напраўляючай, кінуўшы на плошчу Чыкіна з камандаю, дэманструе разуменне праблем, але нічога не абяцае. Праўда, нічога кардынальнага і не робіць. «Плыве» за Расіяю, з трывогаю, надзеяю і боязню чакаючы, што там яшчэ выкінуць. Быццам бы намагаючыся яшчэ раз даказаць неўміручы ленінскі пастулат аб усясветным значэнні падзей, якія раз-пораз адбываюцца ў Маскве або Піцеры.

...Аракулаў даўно павывелі. Але адукаваныя людзі яшчэ засталіся, і нават калі-нікалі з'яўляюцца новыя. Тое, што маглі, яны ўсё ж такі рабілі: папярэджвалі, пераконвалі, прапаноўвалі. Непрыемна было слухаць? Але гэта пытанне не да тых, хто гаварыў, а да тых, хто слухаў.

З якой раз'юшанасцю і ваяўнічасцю асуджаліся многімі з тых, хто сёння ў першых радах «радетелей», ідэі нацыянальнага адраджэння, суверэнітэту, уласнай арміі, грошай... Спіс можна прадоўжыць. Ды што з таго.

Колькі гаварылася аб абароне спажывецкага рынку, аб разгуле гандлёвай мафіі і «беспределе» чыноўнікаў, якія давалі дазвол і вывозілі з рэспублікі жыццёва неабходныя метэрыялы, сыравіну. Што змянілася? Людзям «заткнулі» рот купонамі, стварылі бачнасць вялікай работы, адняўшы разам час і нервы з-за адразу вырасшых чэргаў. А што, паменшыліся за апошні час калоны аўтамабіляў на пагранічных пунктах у Брэсце і Гродне? А колькі тавараў вывозіцца літаральна «за дзякуй» у братнія краіны СНД. Праўда, не чутно, каб там так жа імкнуліся аддзякаваць сястру Беларусь, хіба што асобных яе сынкоў...

На днях люду, які ўжо захлынуўся фальшывымі абяцаннямі і пустымі грашыма, урад самавіта выдаў, што «будуць захаваны да асаблівага рашэння ўстаноўленыя дзяржаўныя рознічныя цэны на хлеб, малако, мяса і мясапрадукты...» Пэўна недалёка, усяго праз вуліцу Савецкую, перайсці ў хлебную краму, каб упэўніцца, што хлеб «Вясковы» каштуе ўжо не 4 р. 51 кап., а «Нарачанскі» таксама стаў больш важкім у цане. Снажаце, дробязь? Але такіх «дробязей» можна прывесці колькі яшчэ. Уласна кажучы, словам урада, пэўна, ніхто і не верыць, калі паглядзіш на вялізныя чэргі ў крамах у чаканні новага павышэння цэн. І зноў гандлёвая ліхаманка, і зноў гандлёвы «беспредел». Калі пярловая крупа пераведзена ў разрад вострадэфіцытных, то куды ўжо больш. Зрэшты, што паўтараць агульнавядомае—народ жыве сваімі, клопатамі, урад і Вярхоўны Савет—сваімі. Адны не ведаюць, якія паперкі яшчэ прыдумаць, другія—куды падзець купоны, як і чым атаварыць талоны. І засунуўшы пры адыходзе на работу некалькі пар пустых бутэлек для закупу малака, кефіру ці чагонебудзь больш градуснага, бразгаючы імі, бы пабірушкі з парку імя Чалюскінцаў, штурмуюць цытадэль—падышоўшы трэйбус...

Як дружна мы клялі бессумленнасць эпохі застою, потым перабудовы! Але чым лепш бессумленнасць цяперашняга пераходнага перыяду? І самае страшнае, што яна нават нарастае: даказаўшыя сваю неплацёжаздольнасць па-ранейшаму робяць даўгі. Я не заклікаю капаць для кагосьці даўгавую яму. Але як нам самім з яе выбрацца, калі гэтыя подпісы стаяць пад вексялямі і лічацца сапраўднымі. Як казалі нашы продкі: «У раллі агрэх—у кішэні прарэх».

Іван КАХНОВІЧ («ДВ»).

● У МІНГАРСАВЕЦЕ

НОВЫЯ КРАСАВІЦКІЯ ТЭЗІСЫ,

АЛЬБО ЯК ДЭПУТАТЫ ЎСПОМНІЛІ ЗНАКАМІТЫ ТАНЕЦ «КРОК НАПЕРАД — ДВА НАЗАД»

Мы паведамлялі ўжо, што 23 сакавіка адбыўся сход дэпутатаў Мінгарсавета, на якім вырашана ў бліжэйшы час склікаць пазачарговую сесію гарадскога парламента. Чытачы ведаюць, што асаблівага адзінства сярод дэпутатаў дасягнута не было, акрамя непераможнага палажэння, што трэба нешта мяняць. Тым не менш, патрэбная колькасць галасоў пад патрабаваннем склікаць сесію (а менавіта 72) была сабрана, і яна, безумоўна, адбудзецца, а нам дэпутаты-ініцыятары падаравалі чарговую порцыю тэзісаў, што прагучалі на прэс-канферэнцыі ініцыятыўнай групы.

— Парадак дня будучай сесіі, —паведаміў, адкрываючы прэс-канферэнцыю, дэпутат Георгій Стэльмах, — «Аб адпаведнасці кіраўнікоў Мінгарсавета займаемым пасадам». Таямнай сенсацыйнасці ў гэтым няма, абодва кіраўнікі — і Аляксандр Герасіменка, і Анатоль Гурыновіч — сумленныя людзі, прычына крыецца куды глыбей. Проста Мінскі гарадскі Савет працуе неэфектыўна, прытым зараз ён скаціўся ў яму крызісу і блізкі да клінічнай смерці. І таму група дэпутатаў вырашыла сабрацца, каб прааналізаваць сітуацыю і ці знайсці з яе выйсце, ці сказаць: «Прабачце, мы больш працаваць эфектыўна не можам». Яшчэ раз падкрэслю — адстаўка кіраўнікоў — не самамэта ініцыятыўнай групы. Мэта — стварэнне ў Мінску высокаэфектыўнай сістэмы ўлады: выбары мэра, мэрыі, стварэнне муніцыпалітэта. А пакуль нам трэба рэанімаваць гарадскі Савет. Каб рэанімаваць, трэба знайсці вытокі, прычыны смерці. А асноўная прычына, на наш погляд, — нізкі ўзровень кіраўніцтва гарадскім Саветам.

Хачу яшчэ дадаць, — працягваў Георгій Фаміч, — што патрабаванне па скліканню сесіі падпісалі прадстаўнікі ўсіх груп, усіх фракцый гарадскога Савета. Г. зн. гэтая сесія — не вынік нейкай кулуарнай барацьбы, кулуарных інтрыг.

Далей прысутныя дэпутаты адказалі на нешматлікія пытанні нешматлікіх прадстаўнікоў сталічнага друку. Адно з галоўных абвінавачанняў у адрас сённяшняга кіраўніцтва — адсутнасць належнай праграмы дзеянняў, невыкананне таго, што выпрацавана Саветам, адсутнасць падтрымкі дэпутацкіх пачынанняў.

Георгій Стэльмах даволі падрабязна растлумачыў прадстаўніку газеты «Рэспубліка», што такое мэрыя, муніцыпалітэт і якія паміж імі павінны ўзнікаць адносіны. Заявалася неявялікая справка наконт таго, захаваецца ў горадзе савецкая ўлада ці не, і ў выніку знайшлі кампрамісное рашэнне: улада застанецца, але не ў такім выглядзе, як таго хацелі бальшавікі ў красавіку сямідзесяцігадовай даўнасці.

Канферэнцыя атрымлівалася нецікавай і сумнай, і сітуацыю выратавала толькі пытанне пра перспектывы будучай сесіі. Усё той жа дэпутат Стэльмах паведаміў, што занадта аптымістычным назваць іхні прагноз на будучае нельга. Набраць неабходныя сто два галасы для прыняцця кардынальнага рашэння вельмі цяжка. Але магчыма, таму што ў адваротным выпадку забяспечаны 99 працэнтаў гарантыі, што сесія стане апошняй у жыцці сённяшняга Савета. І калі кардынальнае пытанне аб замене кіраўніцтва вырашыць не ўдасца, то на рэформы структуры ўлады дэпутаты, на думку прысутных, згодзяцца.

Кандыдатуры замест Аляксандра Герасіменкі няма, але ініцыятары ўпэўнены, што і сярод дэпутацкага корпусу, і сярод мінчукоў (у выпадку свабодных выбараў) патрэбны чалавек знойдзецца. Як кажуць, «свята месца пуста не бывае».

Што ж, прэс-канферэнцыя, хоць і не дала грамадскасці нейкай новай інфармацыі, дапамагла ўдакладніць пазіцыі ініцыятыўнай групы. Але гэта, па-праўдзе, толькі з аднаго боку. Бо з другога — яна яшчэ больш зблытала карты.

Мы разумеем і падтрымліваем намеры «рэанімацыі» Савета, а таксама і выканаўчай улады, але атрымліваецца нейкая недарэчнасць. У звароце да калег-дэпутатаў ініцыятары ўсё ж асабліва падкрэсліваюць вось такі пункт: «Бліжэйшай задачай лічым змену кіраўніцтва Мінгарсавета, якое неэфектыўна працуе». А са слоў Георгія Стэльмаха вынікае, што мэта—рэфармаванне структуры ўлады, нават калі А. Герасіменка застанецца «на троне». Дык што лічыць галоўнай задачай? Не вельмі зразумела таксама, чым так дапёк некаторых дэпутатаў Анатоль Гурыновіч, які з вялікім жаданнем працаваў над стварэннем Малога Савета — таго самага прафесійнага гарадскога парламента, за які змагаюцца ініцыятары.

Назіральнікам таксама добра вядомы і той факт, што расстаноўка сіл у сённяшнім Савеце паміж умоўнымі «дэмакратамі» і «кансерватарамі» выглядае як пяцьдзесят на пяцьдзесят, і любы бок у патрэбны момант можа зблакіраваць прапанову другога. Дык можа, у гэтым у першую чаргу крыецца прычына неэфектыўнасці работы гарадскога Савета?

Яшчэ адно пытанне, якое абавязкова ўзнікае, калі зазірнуць у недалёкую перспектыву. Калі справа дойдзе да выбараў, колькі працэнтаў мінчукоў прыйдзе на выбарчыя ўчасткі, улічваючы сённяшні стан палітычнай актыўнасці? І ці прадбачаць левыя сілы той дзікі вэрхал, які ўзнімуць неабальшавікі ва ўмовах выбараў? А тут можна нагадаць, што «таварышам» ужо няма чаго публіць, і ў ход будзе пушчана любая зброя, што трапіцца пад руку. Дык хто лепш на гарадскім троне: спадар Герасіменка ці таварышы Чыкін, Місунаў або ім падобныя? Я катэгарычна не згодны з тым, што асаблівай розніцы няма.

І апошняе. Яшчэ на ініцыятыўным сходзе выявіўся такі спектр думак і меркаванняў сярод прысутных сямідзесяці дэпутатаў, што сумняваецца ў неэфектыўнасці пазачарговай сесіі не даводзіцца. Жаданне зрабіць крок наперад усё роўна абернецца ў лепшым выпадку таптаннем на месцы.

Дык можа не дарэмна я ўспомніў танец старога Саламона:

«Три шага налево,
Три шага направо,
Шаг вперёд и два назад».

Максім ГРЭК («ДВ»).

МІНСКІМ ВУЛІЦАМ — СЛАВУТЫЯ ІМЁНЫ!

У пярэдадзень чарговага пасяджэння выканкама Мінскага гарадскога Савета, які мае намер зацвердзіць новыя найменні вуліц, у рэдакцыю «ДВ» прыйшоў ліст ад сяброў тапанімічнай камісіі Беларускага краязнаўчага таварыства, дзе яны выказваюць свае меркаванні па гэтай праблеме. Прапануем увазе нашых чытачоў некаторыя фрагменты з ліста мінскіх краязнаўцаў.

«Функцыяніраванне Мінска як сталіцы дзяржавы... абавязвае размясціць паўную групу персаніфікаваных назваў з першага раду нацыянальнага пантэону менавіта ў тапанімічным арэале, блізкім да гістарычнага і цяперашняга палітычнага цэнтру. Калі казаць пра вуліцы, пазначаныя гарсаветам для першачарговага перайменавання, то прапановы нашай камісіі наступныя:

1. в. Мяснікова (XIX—пачатак XX ст.—Новамаскоўская)—**ВУЛІЦА КНЯЗЯ ГЛЕБА МЕНСКАГА.** Імем «князя Глеба мы звязваем гістарычнае менскае замчышча з горадам, шлях да ячэя ляжыць праз Нямігу.

2. в. Берсана (у XIX—пачатку XX ст.—Трубная)—**ВУЛІЦА АДАМА СТАНКЕВІЧА.** У дадзеным выпадку кіруемся фактам знаходжання на пачатку вуліцы насцёла. Маяўнасць мікрапляца перад насцёлам дае ў перспектыве магчымасць мемарыялізаваць яго з мэтай беларусізацыі канфесійнай сітуацыі лакальна і ўцэлым. Постаць Адама Станкевіча магутная, светлая і трагічная. Беларускі патрыёт — ён загінуў у сталінскім канцлагеры.

3. в. Свярдлова (у XIX—пачатку XX ст.—Каломенская) — **ВУЛІЦА ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА.** Выдатны беларускі навуковец, палітычны, культурны дзеяч нацыянальнага Адраджэння, адзін з заснавальнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі, Ахвяра сталінскага тэрору.

4. в. Валадарскага (Гольдштэйна) (у пачатку XIX ст.—Лошыцкая, пасля 1870—Серпухоўская) — **ВУЛІЦА КНЯЗЯ РАГВАЛОДА.** Летапісны князь стаяў ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці—Полацкага княства.

5. в. Урыцкага (Захарэўскі завулак) — **ВУЛІЦА КНЯЗЕЎНЫ РАГНЕДЫ.** Гордая дачка Рагвалода, маці Ізяслава. Сімвалічным бачыцца сход вуліц Рагнеды і Рагвалода ў бок гістарычнай Нямігі».

МІНСК СЁННЯ. НА ВУЛІЦЫ пакуль што ЛЕНІНА.

Фота Міхаіла МАРУГІ.

ІНФАРМБЮРО

КАЛЯНДАР

ВЯСНА. 97 ДЗЕНЬ ГОДА.
СОНЦА ўзышло ў 6.31, зойдзе ў 19.53. Даўжыня дня 13.22.
МЕСЯЦ — маладзік.

ІМЯНІНЫ

СЕННЯ: Арцёма, Захара, Пятра, Сцяпана, Ізольды.

ЯК ПАВЕДАМІЎ ГІДРАМЕТЦЭНТР

СЕННЯ ў 11 гадзін у Мінску было 5 градусаў цяпла. Ціск—731 мм ртутнага слупа. Адносная вільготнасць — 99 працэнтаў. Вецер паўночна-ўсходні — 2—7 м/сек.

ЗАЎТРА ў Мінску чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, без істотных ападкаў. Тэмпература паветра ноччу — 2—4 градусы, днём—7—9 градусаў цяпла.

У МІНГАРВЫКАНКАМЕ

● У КАМІТЭЦЕ па эканоміцы сумесна з пастаяннай камісіяй па навуцы, навукова-тэхнічнаму прагрэсу і інфарматыцы гарсавета разгледжана пытанне аб стане інфармацыйнага забеспячэння ўстаноў аховы здароўя горада.

● ЗАВЕРШАНА распрацоўка праекта праграмы інфарматызацыі гарадской гаспадаркі на бліжэйшую перспектыву.

Зарэгістравана 12 новых фірм.

● АДБЫЛОСЯ чарговае пасяджэнне экспертнай камісіі пры гарсавеце. Разгледжаны пытанні, звязаныя з узвядзеннем будынка камерцыйнага банка «Дукат» і праектна-камерцыйнага цэнтра МП «Жнівень-10».

● КАМІТЭТ па камунальнай гаспадарцы, транспарту і сувязі правёў чарговае пасяджэнне гарадской камісіі, дзе былі разгледжаны пытанні аб нечарговай устаноўцы тэлефонаў.

Прэс-цэнтр Мінгарсавета.

ПОМОЩЬ ОТ ЮНЕСКО

СЕГОДНЯ в Минск прибыли иностранные специалисты, направленные ЮНЕСКО, международной организацией «Вельтхильфс» и фирмой «Грид» для передачи и монтажа медицинского оборудования в рамках программы «ЮНЕСКО-Чернобыль». Оборудование предназначено НИИ радиационной медицины. Помимо этого гостям столицы, возглавляемым руководителем программы г-ном Лефевром, предстоят встречи с правительством Республики Беларусь, представителями Минздрава и Министерства иностранных дел.

СОБ. ИНФ. «ДВ».

Вечерний звон

▲ ТЕЛЕФОН СЛУЖБЫ НОВОСТЕЙ 33-49-25

ВАЛЮТА БЫВАЕТ РАЗНОЙ...

УТВЕРЖДЕНИЕ, что «доллар и в Африке доллар», к сожалению, не верно на Беларуси, поскольку Национальным банком республики на сегодняшний день установлены аж четыре курса: коммерческий — 1:100, государственный покупки — 1:25, иностранных инвестиций — 1:15, специальный по импорту — 1:10.

То же и для германской марки: 1:60,88; 1:15,22; 1:9,13; 1:6,09.

Гораздо проще в меняльных конторах коммерческого банка «Комплекс»: доллар — скупка — 130, продажа — 136; германская марка — 76 и 82 соответственно.

Вот и пойми, какой курс верный?

Соб. инф. «ДВ».

ИНВЕСТИЦИИ ЗАРУБЕЖНОГО КАПИТАЛА

С 16 ПО 18 АПРЕЛЯ в столице республики будет находиться делегация международной корпорации «Чикаго Фармакон». Гости привезут благотворительную помощь. Планируется провести переговоры на правительственном уровне о дальнейших инвестициях американского капитала в экономику республики. Кроме этого, у зарубежных друзей есть конкретные предложения о совместном строительстве фармацевтического завода, теннисного центра и подписании с ПО «Криница» контракта о совместном производстве соков и сухих напитков.

Соб. инф. «ДВ».

ДИКТУЕТ РЫНОК

В БЫВШЕМ институте народного хозяйства, ныне экономическом университете — перемены — появился ряд новых факультетов, изменились направленность и названия уже существующих. В числе новых — факультеты менеджмента внешнеэкономических отношений, банковского дела. Торгово-экономический и торгово-товароведческий приобрели статус коммерческого. В связи с ростом спроса на бухгалтеров, их подготовкой ныне будут заниматься учетно-экономический факультет и факультет учета и статистики. Вуз, стоящий ближе других к рынку, круто взял в сторону перемен, а их диктуют время и рыночные отношения.

Антонина КУЧКО,
внешт. корр.

ЭКОЛОГИЧЕСКИЙ КАЛЕЙДОСКОП

★ **МИНСК** входит в 4-й десяток наиболее загрязненных городов бывшего СССР. По сравнению с 1990 годом общай смертность минчан возросла на 9,1 процента. При этом тревожно то, что растет смертность от онкологических заболеваний, болезней системы кровообращения и органов дыхания, ведь это связывается с загрязнением окружающей среды.

★ **В ПРОШЕДШЕМ ГОДУ** выброс вредных веществ в воздух над Минском увеличился на 10—12 тысяч тонн. Это произошло за счет изменения баланса топлива на тепловых электростанциях, где вынуждены применять мазут, в том числе и с высоким содержанием серы.

★ **ВЫБРОСЫ** в атмосферу на машиностроительных предприятиях уменьшены на 3—4 тысячи тонн за 1991 год: была закрыта часть литейного производства на тракторном заводе, начался общий спад производства. Тем не менее, в микрорайонах вокруг МТЗ каждый третий случай заболеваний органов дыхания зависит от выбросов этого предприятия...

★ **ПО СВЕДЕНИЯМ** Минского областного комитета охраны природы, Минск сбрасывает в сутки 720 м³ сточных вод в Свислочь. Эти регулярные выбросы постепенно загрязняют реку, сейчас «след» деятельности города и его предприятий дошел уже до Осиповичского водохранилища. Особо неочищенные стоки с предприятий идут, как правило, вечером и ночью. А Минская станция аэрации уже неспособна справиться со всеми стоками. Остро стоит и проблема утилизации грязного ила, который образуется там после очистки.

★ **ОДНАКО** на внедрение новых технологий, на строительство новых очистных сооружений под Минском сейчас нет денег. В прошлом году эти работы финансировались за счет фонда охраны природы, куда отчислялись штрафы за загрязнение среды. Теперь же экологический налог идет в бюджет, но не на цели экологии...

(Соб. инф. «ДВ»).

ПРОСЯТ ПОМОЩИ У ТРАНСПОРТНИКОВ

Как сообщил «Добраму вечару» заместитель председателя горисполкома Г. П. Сенькевич, особое внимание при организации уборки города уделяется транспорту. Поэтому решили просить коллектив объединения «Минскгрузавтотранс» на субботнике 11 апреля помочь родному Минску и безвозмездно отработать в этот день на вывозе мусора с улиц и с дворовых территорий.

Соб. инф. «ДВ».

ЭКСТРАСЕНС ПЕРАСЯЛІЎСЯ

УЖО вядомы нашым чытачам па папярэдніх публікацыях у «Добрым вечары» народны лекар і экстрасенс Рыгор Анастасавіч Кавалевіч у гэтыя дні святкуе наваселле. З цеснага пакойчыка ў адным з дамоў па Партызанскім праспекце член Міжнароднай асацыяцыі медыцынскай парапсіхалогіі і нетрадыцыйных метадаў лячэння разам са сваімі памочнікамі ды асістантамі заняў пункт аховы здароўя Мінскай агароднінная фабрыкі, што на Магілёўскай шашы. За гэта Рыгор Анастасавіч не толькі гаворыць дзякуй і аплачвае арэндную плату названаму прадпрыемству, але ж і прымае работнікаў фабрыкі па-за чаргой. А яна, між іншым, не малая, вядзецца папярэдні запіс усіх жадаючых лячыцца ў знакамітага дыпламаванага спецыяліста.

Тым не менш для чытачоў газеты паведамляем: Р. А. Кавалевіч прымае па панядзелках, аўторках, чацвяргах ды пятніцах. Кантактны тэлефон: 43-11-17. Ехаць любым транспартам, што курсіруе ў пасёлак Шабаны. Прыпынак «Мінская агароднінная фабрыка».

Алесь СЯРГЕЕЎ («ДВ»).

ПОДГОТОВКА К СЪЕЗДУ ИДЕТ ПОЛНЫМ ХОДОМ

В республике проходят региональные собрания членов партии народного согласия (ПНС). Тема собраний одна: подготовка к учредительному съезду, который пройдет в Минске 11 апреля. На заседании оргкомитета ПНС к настоящему времени уже выработаны проекты программных документов, Устава, отработаны некоторые организационные вопросы. Недавно состоялась встреча оргкомитета с народными депутатами различных уровней. Завтра, 7 апреля, в 18.00 намечено провести собрание минчан-сторонников партии народного согласия. Приглашаются все желающие. Контактный телефон: 56-68-95.

Я. АНАПРИЕНКО,
член оргкомитета ПНС, народный депутат горсовета.

СНОВА ВЕСНА, СНОВА ЯРМАРКА...

8—10 апреля в комплексе «Минскэкспо» пройдет традиционная оптовая международная ярмарка «Мінскі кірмаш. Вясна-92». На 3 апреля заявки на нее подали 435 участников, четверть из них приезжает сюда повторно.

Как сообщил на пресс-конференции в Союзе предпринимателей Беларуси директор фирмы «Мінскі кірмаш» А. А. САВИН, будут представлены предприятия всех форм собственности из стран СНГ, Закавказья и Балтии. Свои товары выставляют также фирмы Бельгии, Германии, Индии, Испании, Китая, Швейцарии и Польши.

Отмечен рост участия государственных предприятий (более половины заявок). Больше стало продавцов, снизилась доля государственных торговых структур, которые уступят коммерческим организациям. Значительно расширен круг предложений.

9 апреля в рамках ярмарки состоится семинар по вопросам коммерческой деятельности. Кроме отечественных специалистов и представителей министерств и ведомств, в нем будет участвовать гость из Канады, профессор Гарвардского университета Э. Барнхилл.

Ярмарка снова пользуется поддержкой правительства Беларуси. По поручению М. Мясниковича министерства и ведомства организуют лицензирование ввоза и вывоза на месте, в выставочном павильоне.

Андрей ПОТРЕБИН («ДВ»).

● ДЕЛОВОЙ МІНСК

ПОД ЗНАКОМ КООПЕРАЦИИ

ДВА дня, 1 и 2 апреля, в столице Беларуси проходил семинар «Кооперация и бизнес», на который собралось около 60 руководителей потребительской, производственной кооперации и предпринимательства почти из всех государств СНГ. Среди участников семинара были сотрудник Венского центра ООН по социальному развитию и гуманитарным проблемам А. Д. Винокуров, вице-президент Итало-Белорусской торговой палаты (Италия) А. Санджорджио, президент международной профсоюзной конфедерации «Консолидация» Э. Лернер и другие.

— Впервые за последние годы вместе собрались представители всех видов кооперации,— говорит В. А. Пономарев, генеральный директор Ассоциации делового сотрудничества «Гарант», организовавшей семинар. — За эти несколько дней выявилось стремление людей к сотрудничеству. Кооперация должна работать без границ, должно существовать общее экономическое пространство. Общаясь, обсуждая настоящее и будущее кооперативной и предпринимательской деятельности, участники семинара приняли обращение к Верховным Советам и правительствам государств, в котором выработали рекомендации по перспективам развития кооперативного движения. Надеемся, эти рекомендации будут реализованы. Кстати, осенью этого года 47 сессия Генеральной Ассамблеи ООН рассмотрит вопрос о кооперации. А 1995 год, видимо, будет объявлен годом кооперации.

СОБ. ИНФ. «ДВ».

КРИМИНАЛ-СЛУЖБА «ДВ»

СРАБОТАЛИ ОПЕРАТИВНО

★ **ПАТРУЛЬНЫЙ НАРЯД** Заводского РОВД в Чижовке задержал ранее судимого и нигде не работающего 29-летнего М., который, находясь в пьяном виде, из хулиганских побуждений избил 56-летнего рабочего одного из производственных объединений города С. А сотрудники ГАИ Советского РОВД «повязали» 32-летнего кооператора Г., выхватившего бутылку водки из сумки жительницы Минского района и попытавшегося скрыться.

Задержанные водворены в изолятор, проводится расследование.

ЗЕРКАЛА НУЖНЫ ВЕЗДЕ, ДАЖЕ В ИОРДАНСКОМ КОРОЛЕВСТВЕ

★ **РАНЕЕ СУДИМОГО** за кражу и грабеж 46-летнего К. привлекло зеркало заднего вида автомашины с иностранными номерами. Благодаря умелым действиям вездесущих сотрудников оперативно-поискового отдела УВД Мингорисполкома снявший зеркало задержан. Подданому Иорданского Королевства (он же — аспирант Белгосуниверситета, он же — хозяин автомашины) горевать не придется — преступление пресечено.

И НОЖИ НЫНЧЕ ДОРОГИЕ...

★ **В ОКТЯБРЬСКИЙ РОВД** обратилась домохозяйка Я. — три дня назад неустановленный преступник вошел в открытую дверь ее квартиры и, угрожая насилием, похитил 500 рублей, наручные часы, два хрустальных фужера и... кухонный нож. Спустя некоторое время сотрудники Октябрьского РОВД «познакомились» с преступником, как говорят, на дому последнего. Пришлось ему сменить место пребывания на менее уютные апартаменты.

В процессе расследования был установлен «герой» другого совершенного преступления (так получилось, что эти два ЧП «переплелись»). Сыщики распутали этот злосчастный клубок и расставили все (и всех) по своим местам.

Остается добавить, что обоим преступникам по 18 лет...

● КАК ОБУСТРОИТЬ БЕЛАРУСЬ

РЕФОРМЫ НЕ ДЛЯ ФОРМЫ

ПРИВАТИЗАЦИЯ В ИНТЕРЕСАХ БОЛЬШИНСТВА

(Продолжение. Начало в №№ 53, 55, 58, 60, 63.)

Наша новая беседа с экспертом парламентской оппозиции, вице-президентом Западной фирмы недвижимости А. А. Станкевичем — о приватизации.

— Анатолий Анатольевич, видимо, пора обратиться к непосредственным интересам людей. Как же Вы представляете сегодня решение вопроса собственности?

— Все исходит от человека и от его интересов. Собственность на них влияет очень сильно. Я придерживаюсь мнения, что собственнические мотивы изначальны в человеке. Как только приводим их в действие — обнаруживаем совершенно иное отношение к труду. Человек начинает лучше работать, меньше транжирит время, больше занимается профессиональным самосовершенствованием. Частная собственность — сильная и жесткая система...

— Но ведь скажут: зачем включаться в эту гонку, давайте, не напрягаясь, сделаем всем хорошо!

— Эти люмпенские уравнительные настроения пустили у нас глубокие корни. А надо без лицемерия признать: хорошо человеку бывает только тогда, когда он хорошо делает свое дело. Хорошо же он его делает, когда знает, что оно — его, личное. Частный интерес заложен генетически. И надо воспроизвести его на государственном уровне.

— То есть, необходима приватизация. Но как! Многие хотели бы получить свою часть национального богатства. Многие получают и побольше, пользуясь неразберихой. Что, так и будем драться над пирогом! Или можно сделать это цивилизованно, разумно, с учетом интересов большинства людей!

— Давайте посмотрим на существующие методы приватизации. Есть три принципа. Если, конечно, это не «прихватизация», а действительно государственная политика. Во-первых, принцип исторической справедливости.

— Справедливости в чью пользу!

— До 1917 года предприятиями и землей владели конкретные собственники. Потом их экспроприировали, национализировали собственность. По пути возврата пошли кое-где в Восточной Европе, пытаются проводить это и в Балтии. Вроде бы правомерно, но... надо учитывать, как у нас за 70 лет трансформировалась психология. Нельзя безболезненно для общества отмотать пленку назад.

— И, по-моему, просто невозможно сегодня вернуть наследников Потоцких и Радзивиллов на прежние земли.

— Мы получим тогда глобальный конфликт в обществе. У нас и без того полно проблем. Зачем создавать еще одну?

— Крестьяне скажут: мы поддержали революцию 1917 г. ради земли...

— А вот Восточная Европа меньше пробыла в рамках социализма. Там была и частная торговля, а в Польше — и частное землевладение. У нас же социализм выступил в крайне жесткой форме, он изменил нас, во многом — необратимо. Поэтому путь исторической справедливости — самоубийство для реформ.

Второй принцип — социальная справедливость.

— Собрать все вместе и поделить поровну!

— Да. Светлая мечта многих. Но сделать-то это невозможно. Люди ведь разные, они внесли разную долю в общее богатство. И вообще, что можно назвать социальной справедливостью? По-моему, это возможность реализовать себя и свои генетические способности. Нужны, по возможности, равные стартовые условия. А потом один станет богатым, а другой пустит свою долю по ветру.

— Как в библейской притче о талантах: один закопал в землю, другой истратил, третий приумножил...

— И система социальной справедливости должна дать изначальную отправную точку максимально большему числу людей. При нулевом капитале трудно разбогатеть.

— Но можно ли механически справедливо разделить все поровну!

— Нельзя. Разобьем все на кусочки, лоскутки. Люди опять не будут заинтересованы, будут отчуждены. Получим всеобщую нищету: работает большой концерн «Государство», а нам с вами — ни тепло, ни холодно от одной-двух его акций.

— А боны и приватизационные счета, предложенные в проекте Закона о приватизации!

— Это возможно, во-первых, в условиях небольшого моноэтнического государства, во-вторых, когда есть власть, которой большинство доверяет. У нас же не верят ни высшей, ни местной власти. В-третьих, должна функционировать собственная национальная денежная единица.

— Каков же третий путь!

— Я назвал бы его — государственная целесообразность. Проще говоря, выкуп. Хотите иметь собственность — купите ее.

— Извините, на какие деньги! Государство только и делало, что выжимало из каждого соки...

— Вот именно. Ведь зарплата, которую нам платили, была вовсе не зарплата, а минимум для простого воспроизводства рабочей силы. Мол, чтобы и с голоду не умер, и детей вырастил для войны в Афганистане. Путь всеобщего выкупа неверен, ибо не учитывает реальность. Народ беден, и опасно предлагать ему все выкупить.

— Но куда деваться! От приватизации же не уйти!

— Надо объединить все лучшее из трех принципов, отбрасывая и упреждая худшее. Мне выход видится в методе квотирования. Какая-то часть собственности переходит к трудовому коллективу, и он ею распоряжается. Например, выпускает акции на сумму своей квоты и наделяет ими работников в соответствии со стажем и др.

— Что же остается пенсионерам, которые здесь работали!

— В долю трудового коллектива, по-моему, их включать не следует: разбавим мотивы и интересы, а эти люди не создадут уже новую стоимость.

— Но они создавали стоимость старую! А еще есть интересы чиновников, военных, учителей, врачей, государственных служащих, всех, кто финансируется из бюджета.

— Надо дать квоту местным органам власти, но не Советам, а мэриям. Эти акции гарантировали бы источники социальных программ.

— Должно ли государство получить свое!

— Несомненно. У него — масса общенациональных проблем: экология, инфраструктура, коммуникации, капиталовложения в фермерское сельское хозяйство. Нужны деньги, и немалые.

Итак, собственность разделяется на три квоты: коллективная, муниципальная и государственная...

— Ну, а я приду в мэрию и скажу: давайте мне мою долю!

— Вы сможете с ними согласовать конкретный путь использования этой доли: на покупку квартиры, на открытие своего дела, и др. Но это — не в рамках самой программы приватизации. Выбрали мэра и депутатов — доверили им по-хозяйски распорядиться квотой. И местная власть должна максимально удовлетворять потребности жителей своей территории.

— Как же делить на три! Где границы квот, каковы соотношения!

— Для этого стоит разграничить предприятия по стоимости основных производственных фондов на мелкие, средние, крупные и монополии. В каждом случае — разное соотношение.

— Начнем с мелкого. Например, швейное ателье.

— Оно, по сути, уже давно выкуплено, через обновление производственных фондов. Государству надо отсюда уйти. 60 процентов акций получит коллектив, а 40 пусть берет муниципалитет. Хочет трудовой коллектив — пусть выкупает у местных властей их часть.

— Аренда с выкупом!

— Нет, просто корпорация, где один дольщик постепенно увеличивает свою долю.

— А если среднее предприятие, скажем, небольшой кирпичный завод!

— Квота коллектива уменьшится. Сюда должно войти государство. Коллектив получит 40 процентов, местная власть и государство — по 30. На крупных предприятиях (вроде Минского станкостроительного завода им. Кирова) полагаю правомерными квоты коллектива и местной власти —по 30 процентов, а долю государства — до 40. Так контрольный пакет акций не попадает в руки чиновников, а интерес коллектива и местных властей совпадает. Им ведь придется вместе жить и работать на этой территории, обустраивать ее.

— А монополии—«Гомсельмаш», МАЗ, МТЗ!..

— Здесь доля коллектива должна уменьшиться до 21 процента, квота государства— вырасти до 49, а участие местных властей — остается неизменной — 30 процентов. Опять бюрократия не имеет контрольного пакета (зачем чиновникам руководить экономикой!). Но обеспечена защита интересов общегосударственного характера.

Так мы сможем гармонизировать все интересы. Начиная от ателье и кончая гигантом индустрии, квота трудового коллектива уменьшается номинально, но возрастает фактически. Мотивация у работников растет. По всей цепочке государство устраняется от оперативного управления собственностью. Государство получает государево, а общество и коллективы, т.е. люди — то, что должно им принадлежать. Но это подходит только для приватизации в промышленности. В сельском хозяйстве, торговле должны быть заложены другие соотношения квот. Там другая скорость оборота капитала, другие условия.

Беседовал Андрей ПОТРЕБИН.

(Продолжение следует).

● ВЫПРАБАВАНА НА САБЕ

РЭПАРТАЖ З СЯМ'ЁЙ НА ШЫІ

АДЗІН ВЕЧАР У СКУРЫ ПРЫВАТ-ТАКСІСТА

Зрэшты, нічым асаблівым чытача я не здзіўлю. Хто з нас, атрымаўшы колькі соцень «акупацыйных» рублёў за паўмесяца работы, літаральна праз некалькі дзён раптам не знаходзіў, што заўтра не будзе на што набыць малому малако, жонцы—булачку, а сабе хоць пачак цыгарэт. І тых, хто таксама трапляў у падобную сітуацыю, здзіўляць я і не збіраўся.

Расказаць я хацеў бы пра іншае, у што акунуўся даволі нечакана. Проста ў адзін з крызісных вечароў у галаву прыйшла думка: а што, калі паспрабаваць зарабіць сёння ж, не молячыся на бліжэйшы дзень зарплаты? Зарабіць нетрадыцыйна — пабыўшы...таксістам.

ЗГАВАРЫЎШЫСЯ з братам жонкі, на наступны вечар мы выехалі «на паляванне». Праўда, перад гэтым з сямі раніцы да дзвюх гадзін дня швагеру давялося праседзець на запраўцы, напаўняючы бак аўто. Ды, як той казаў, усё добра, што добра канчаецца. Бак поўны, і мы таксама поўныя жадання атрымаць за свае паслугі нейкую матарыяльную ўзнагароду.

Першы кліент—як першае каханне. З ветрыкам і хваляваннем ад «1000 дробязей» да кінатэатра «Змена» даімчалі мы сямейную парачку літаральна за некалькі хвілін. Пятнаццаць рублёў, «Нармальна»,— кажа швагер. А я неяк недарэчна ўспамінаю, што ў мінулым месяцы недзе за такую ж адлегласць па лічыльніку дзяржаўнай таксоўкі аддаў амаль два чырвонцы.

Тут жа, на трактарным, у салон ускоквае дзяўчо гадоў васемнаццаці. Што ёй рабіць у восем вечара ў гатэлі «Беларусь», мяне хвалюе менш за ўсё, але, атрымаўшы ў выніку дзесяць рублёў, міжволі бурчу пра тое, што з такіх трэба браць у валюце.

Мы аднадушна вырашаем змяніць тактыку, і ўжо ў наступнага кліента пасля традыцыйнага «куды?» самым бассаромным чынам пытаемся «колькі?». Сорак рублёў з цэнтра на аўтастанцыю «Аўтазавод» нам падыходзіць.

Між іншым, праз нейкі час заўважаем, што самая выгадная справа—каціцца за дзяржаўным таксі з уключаным плафонам. Людзі даверліва ўзнімаюць рукі, але больш сямідзесяці працэнтаў верагоднасці, што таксіст не прыпыніцца, і кліент стане нашым.

Узаемаадносіны патэнцыяльных кліентаў і дзяржаўных таксістаў наогул даволі складаныя. І той, і другі бок робяць выгляд, быццам не заўважаюць адзін аднаго. Стаянка таксі, на ёй—тры машыны, а за дваццаць крокаў наперадзе жанчына з адчаем махае рукой кожнаму праязджаючаму аўто. Аказваецца, хлопцы просяць такую цану, што наша такса для яе—проста дробязь.

Мы, безумоўна, не прафесіяналы. Не толькі ў цэнавай палітыцы, але і ў ідэнтыфікацыі кліентаў таксама. Ну хто мог падумаць, што мужчык з чатырохгадовым сынам на ўскрайку тратуара акажацца такім п'яненькім, што свой адрас памятае толькі як «Дражня... Каля трактарнага... Насупраць піўзавода...» Па-праўдзе, вельмі непамысна было глядзець у вачаняты хлопчыка, які ціхенька забіўся ў дальні куточак салона.

Адлегласць ад Камароўкі да «Рыгі» — кландайк для таксістаў. Тры разы едзем па вуліцы Куйбышава—і тры разы падбіраем кліентаў. Дзяўчына, якая вязе ад інтэрната нейкага араба ў Зялёны Луг, яўна перапівае, у трэці раз нагадваючы нам, што яны жадаюць папіць кавы. Лепш бы памаўчала, бо ў мяне ўжо язык свярбіць адгукнуцца.

Мінск—сталіца Беларусі. І ніякія спасылкі на энергетычныя цяжкасці рэспублікі не апраўдваюць, на мой погляд, тое, што па некаторых вуліцах даводзіцца ездзіць з дальнім светам фараў: цемра, хоць вока выкалі. Гэта па-савецку: эканоміць электраэнергію, з'эканоміўшы на інтарэсах гараджан.

Здаецца, пашэнціла: нарваліся на нейкую заможную сямейку. Муж, жонка, а за намі панію і маленькі сынок, пэўна, не трасуцца над лішнім «чырыкам», шчодра аплаціўшы кожны кіламетр лічыльніка на спідометры.

Дарэчы, наконт заможных грамадзян — уражвае чарга на камерцыйнай запраўцы па Ракаўскай шашы. Паўсотні, а то і больш легкавушак чакаюць магчымасці выкласці мой тыднёвы заробак за бак бензіна.

Раблю для сябе невялікае адкрыццё: каля дзесятка даішнікаў нясуць службу на вуліцах горада ў гэты вячэрні час. Самы мужны—на плошчы Якуба Коласа. На працягу дзвюх гадзін мы, праязджаючы міма яго, бачылі адну і тую ж застылую позу. Далібог, большае майстэрства, чым у крамлёўскіх курсантаў.

Бліжэй да адзінаццаці натоўпы аднолькавых хлопчыкаў з'яўляюцца каля кафэ і бараў горада. Коратка стрыжаная, у скураных куртках і найчасцей у спартыўных касцюмах, гэтая маладая генерацыя саўкогых прадпрымальнікаў яшчэ не паспела скалаціць грошай на сваю машыну, але заплаціць любыя грошы шэфу-таксісту яна ўжо гатова. Тым не менш, асаблівага жадання насадзіць гэткую кампанію ў сваё аўто не з'яўляецца. Як казаў паэт, праўда, з другой нагоды, «жыць застанешся, жыццё даражэй». Нават з улікам таго, што мы спецыяльна паехалі ўдвух.

Лепш ужо закінуць дадому мілавіднае і яшчэ смакатае дзяўчо, якое тут жа задыміла цыгарэткай, а ўрэшце была гатова заплаціць за праезд чым душа пажадае, абы не сціплым змесцівам сваіх кішэняў. Ды, так бы мовіць, не за тым мы ехалі.

У чарговы раз апынуўшыся непадалёк ад дома, рашуча збочваем у двор. На сёння досыць. Кішэня прыкметна ўспухла ад рознакаляровых паперак.

Вынік: за тры-чатыры гадзіны работы—трыста трыццаць рублёў. Мінус трыццаць за той бензін, які праездзілі за гэты час (па дзяржкошту). Няблага?

Тым не менш, прашу вашага дазволу, дарагі чытач, не падпісвацца. Бо сённяшнім вечарам я парушыў закон. Мой сённяшні прыбытак не прынясе ні капейкі ў карман дзяржавы. І яна б мне гэтага не даравала.

Калі б я набыў патэнт і пачаў займацца прыватным падвозам на законных правах, карцінка атрымалася б выключна цікавай. З сённяшніх трохсот трыццаці сто дваццаць бы пайшло ў падатак. Трыццаць, зноў жа, на бензін. У выніку сто семдзесят рублёў на дваіх ну аніяк не можа амартызаваць кошту аўтамабіля, чыя падвеска кожную хвіліну знаходзіла на вуліцах горада яміну, якая спакойна магла б стаць апошняй у гэтым неспакойным жыцці. Нагадаю, што больш-менш прыстойнае аўто сёння дзяржава прапануе мне па сто семдзесят—сто дзевяноста тысяч рублёў.

І менавіта таму я не пайду браць патэнт. І менавіта таму вы, любыя мае мінчукі, зноў будзеце стаяць на ўзбочынах дарог з паднятымі рукамі і чакаць, як Бога, залётнага «таксіста». І менавіта таму дзяржаўныя машыны будуць і надалей шукаць «свайго» кліента. І менавіта таму, паспытаўшы гэткага бізнесу, на вуліцы свайго горада я больш не выеду.

А да зарплаты ўсё роўна далёка.

Заракалася сёння за хлеў хадзіць?..

АДЗІН З МІНЧУКОЎ.

ЛЕКІ ВЯЗЕ ДЫРЭКТАР

МІНСК. (Кар. БЕЛТА Леанід Трацэўскі). Складаная аперацыя ў Італіі прынесла амаль поўнае выздараўленне сямігадоваму сыну прапаршчыка з Гродна Андрушы Бралко, які захварэў у выніку ўздзеяння чарнобыльскай радыяцыі. Але пасля вяртання дамоў наступіў рэцыдыў і пачалі праяўляцца сімптомы непрыжыўлення перасаджанага яму ад маці касцявога мозгу. У Мінскім цэнтры, дзе спрабуюць лячыць такія захворванні, не знайшлося патрэбных, да таго ж вельмі дарагіх імпартных лекаў. Але публікацыі ў акруговай ваеннай газеце аказалася дастаткова для таго, каб, прачытаўшы яе, дырэктар Гродзенскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» А. Сямёнаў тут жа прапанаваў сям'і Бралко дапамогу. У адрас італьянскай фірмы «Філтэка»—партнёра беларусаў — паляцеў тэлекс з просьбай прыслаць лекі і ўключыць іх цану ў кошт паставак прадукцыі «Хімвалакна» ў Італію. Фірма вырашыла дапамагчы сыну беларускага ваеннага бясплатна, хоць каштавала гэта некалькі тысяч долараў.

● ОСТРЫЙ СИГНАЛ

Наш читатель Валентин Францевич Заневский обеспокоен состоянием моста через Партизанский проспект возле гостиницы «Турист». После его звонка в редакцию, фотокорреспондент Юрий Захаров сделал несколько снимков путепровода. В каком он состоянии, конечно, лучше судить специалистам дорожно-мостового строительства и благоустройства Мингорисполкома. К ним мы и обращаемся с просьбой прокомментировать фотоснимки.

● ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

ВОЗЬМУ БОЛЬ ТВОЮ И ДАМ НАДЕЖДУ

Это неправда, что жизнь однообразна. Мы все время накануне чего-то. Накануне весны. Накануне знакомства с чем-то или кем-то. Накануне потерь. И еще хуже, если на грани безысходности, на грани падения, если переполнилась чаша терпения, которую суждено нам испить, чтобы попасть в новые, более гуманные времена. Как дожить до них, где взять надежду? С нею легче. С нею терпимей. Сжав волю в кулак и стиснув зубы, с нею отчаянней рвешься вперед. Чтоб не топтаться на месте. Тем более, чтобы не вспять, не назад. И не как страусы — головой в песок.

Отрадно, что есть они, такие люди, с видением реальных оптимистических перспектив. И не где-то далеко, на площади Независимости, а рядом, на твоем заводе.

Недавно мы встретились с одним из них — заместителем председателя Свободного профсоюза МАЗа Михаилом Митрофановичем Мариничем. Он же — слесарь механосборочных работ агрегатного цеха. Он же — выпускник философского отделения факультета истории БГУ. Цель прихода в редакцию: познакомить читателей с преимуществами и перспективами Свободного профсоюза. Предлагаем вашему вниманию беседу с М. М. МАРИНИЧЕМ.

— Михаил Митрофанович, почему возникла нужда создавать на автомобильном еще один, параллельный профсоюз! Люди разуверились. Во всем и вся. В народных депутатах. В велеречивых обещаниях начальства. Неужели вы думаете, что они пойдут за вами, пусть свободным, но профсоюзом, который любит нас всех вместе, но которому до каждого из нас конкретно в общем-то и дела нет!

— За нами — пойдут. Уже пошли. Еще тогда, год назад. В апреле 1991 года. Именно в те дни был создан стачечный комитет Минского автозавода, председателем которого избрали председателя ныне организованного Свободного профсоюза А. Ф. Машканова. Мы, его создатели, были членами стачкома. Как тогда, так и теперь, мы — в оппозиции официальному профсоюзу, заводской администрации. Тогда, в апреле, заводской стачком провел в цехах опрос — голосование за вывод парткомов и комитетов комсомолов за территорию завода. 90 процентов автомобилестроителей высказались за вывод. Официальный же профсоюз во главе с председателем В. Г. Дыбалем не поддержал нас. С тех пор, когда парткомы ушли с завода, более того, из жизни вообще, противостояние заводского профкома и стачечного комитета не уменьшилось. А осенью прошлого года даже стало особенно острым. Поводом послужило одно постановление профкома завода от 29 ноября 1991 года, в котором он, профком, увидел свою цель: не допустить сокращения занятости работающих более чем на 10 процентов.

И мы поняли: пора сказать «нет» профсоюзу, который не в состоянии защитить интересы своих членов. Ни один работник не должен быть уволен в связи с сокращением. Поэтому 26 декабря прошлого года состоялась учредительная конференция Свободного профсоюза работников Минского автозавода. На ней был принят устав, избраны совет из 5 человек, а также председатель профсоюза, ревизионная комиссия. Через месяц в Заводском райисполкоме наш профсоюз был зарегистрирован. Сегодня открыт в АвтоМАЗбанке счет, вскоре будет изготовлена печать, появился свой кабинет в заводоуправлении — вот, пожалуй, и все внешние атрибуты нашей самостоятельности.

Скажу сразу: освобожденных работников у нас нет. Возможно, появится техработник для координации, связи между нами, с внешним миром, подготовки каких-либо документов.

— И вот свободный профсоюз создан. Народ валом повалил в его ряды!

— Повалить-то, конечно, не повалил. Сегодня в рядах профсоюза около 100 человек. Однако это только начало. Мы проводим разъяснительную работу в цехах по созданию первичных организаций. Созданы первички в главном чугунолитейном, агрегатном, шасси, термическом № 4.

— Михаил Митрофанович, что самое привлекательное предлагает Свободный профсоюз пришедшим к его лоно!

— В первую очередь, занятость. Мы не дадим своего согласия на сокращение членов профсоюза. Если же в силу неоспоримых причин работник попадет под сокращение, естественно, с его согласия, ему должно выплачиваться пособие за 12 месяцев, по сегодняшним меркам — это 25 тысяч рублей.

Однако увольнение, я повторяю, крайняя мера. Сокращение можно предупредить открытием альтернативных производств. К примеру, в литейном производстве вполне можно наладить изготовление сковородок, замков, ключей, кухонных ножей, различной несложной техники. То же касается и иных производственных подразделений.

Особый разговор о зарплате. Она должна ежеквартально пересматриваться в связи с изменением розничных цен и пребывать в соотношении с ними приблизительно как 0,8:1.

— Производство — сфера мобильная. Модернизация производства, спрос на те или иные виды продукции со временем меняется. Эти и иные требования вынуждают заводы сокращать количество работающих. Взять, к примеру, МАЗ. Обновление серийной автомобильной техники и количество инженерно-технических работников предприятия, мягко говоря, несопоставимо. В то время, как с гораздо меньшим штатом проектантов на Западе поколения автомобилей меняются через 3—5 лет, у нас — через 10 и более. Так не будет ли более разумно, учитывая автоматизацию современного проектирования, сократить количество ИТР!

— Мы сегодня не говорим о сокращении. Предприятие должно предложить кандидатам на увольнение иную работу на предприятии.

— И пенсионерам тоже!

— К сожалению, пенсионеров от увольнения защитить не сможем. Однако профсоюзы могут предложить потенциальным пенсионерам нечто более существенное, чем та нищенская пенсия, которую выплачивают сегодня. Если нынче отчисления в фонд социального страхования в официальном профсоюзе обезличены, то 5 от 36 процентов заработной платы членов нашего профсоюза, перечисляемой в страховой фонд, откладывается нынче на персональные счета и 1 процент — в резерв профсоюза. К пенсии у каждого соберется приличная сумма, а когда еще работник не будет болеть и не будет брать путевок...

И это только начало. Мы считаем, что в дальнейшем перечисления на личные страховые счета должны проводиться полностью.

Кстати, и оплата санаторных и иных путевок будет осуществляться с личных счетов. Вот тогда-то одни и те же люди не будут дефилировать на юга.

— Михаил Митрофанович, но ведь эти же меры вполне мог бы реализовать и старый профсоюз.

— Думаю, что вряд ли. Наш Свободный профсоюз принципиально отличается от старого тем, что его членом не может быть работодатель: ни директор завода, ни его замы, ни начальник цеха. Кстати, понимая это, некоторые из них уже подают заявления о выходе из профсоюза.

Значит, дело сдвинулось и в этом. Но главное то, что наш профсоюз не оставит один на один со своей бедой тех, кто без пяти минут безработный. А это в наше переходное к рынку время — главное.

Беседу вела Тамара МАРКИНА.

● ПА РЭСПУБЛІЦЫ

«ДРУСКІНІНКАЙСКАЯ» З БЕРАСТАВІЦЫ

Магутная крыніца мінеральнай вады выяўлена ў наваколлях пасёлка Пагранічны Беластавіцкага раёна. Як устанавілі спецыялісты, па сваіх лекавых уласцівасцях яна ідэнтычная мінеральнай вадзе шырока вядомага літоўскага курортнага горада Друскінінкай. Прычым запасы беларускай крыніцы практычна невычарпальныя.

У пасёлку пачата будаўніцтва буйнога завода па разліву мінеральнай вады — між іншым, першага прадпрыемства такога профілю ў Гродзенскай вобласці. Яго праектная магутнасці разлічаны на выпуск 6 тысяч бутэлек у гадзіну. Акрамя таго, на асобнай тэхналагічнай лініі будзе асвоена вытворчасць безалкагольных напіткаў. Прадпрыемства зможа забяспечыць патрэбнасці не толькі жыхароў мясцовага рэгіёна, але і іншых абласцей рэспублікі. Ужо ў наступным годзе, калі завод, як намечана, будзе пабудаваны і пушчаны, яна навінка паступіць у продаж.

Самая багатая крыніца аналагічнай мінеральнай вады выяўлена таксама паблізу вёскі Прывалка Гродзенскага раёна. На базе яе з часам намячаецца пабудаваць санаторый.

К. БАЛАТЭВІЧ, КАР. БЕЛТА.

● У НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ

УСЁ ТАНЧЭЕ КІШЭНЯ ПАКУПНІКА

ВІЛЬНЮС. Паводле даных дэпартамента статыстыкі Літоўскай Рэспублікі, у студзені 1992 года рознічны тавараабарот у фактычных цэнах у 4,5 раза перавысіў студзень мінулага года. Аднак у супастаўных цэнах ён быў на 37,8 працэнта ніжэйшы.

У гэтых жа цэнах у студзені прададзена тавараў на 14,8 працэнта менш, чым у снежні 1991 года. У лютым рознічны гандаль у фактычных цэнах на 9,3 працэнта перавысіў студзеньскі ўзровень, а ў супастаўных цэнах, паводле папярэдніх даных, ён скараціўся на 21,9 працэнта.

КАНЕЦ БЕЗЗАКОННАСЦІ

РЫГА. Даваенныя прадпрымальнікі, гандляры і ўладальнікі розных гаспадарчых аб'ектаў або іх спадкаемцы могуць пачаць пошук сведак аб былой сваёй уласнасці ў Латвійскай Рэспубліцы. Вярхоўны Савет Латвіі вырашыў ужо на наступным тыдні зацвердзіць парадак падачы заяў на дэнацыяналізацыю ўласнасці. Найбольш рэальным тэрмінам заканчэння рэгістрацыі былых прадпрымальнікаў названа 20 чэрвеня 1992 года. Прадугледжана, што ў заяве на атрыманне былой уласнасці не ўладальнік або яго спадкаемцы змогуць указаць падыходзячы для сябе варыянт: вяртанне маймасці, кампенсацыю яе кошту ці выкуп — у выпадку, калі дзяржава або самакіраванне пасля нацыяналізацыі або іншага роду адчужэння ўклалі ва ўласнасць свае сродкі.

СТУДЭНТЫ ВЫБІРАЮЦЬ САБЕ РАБОТУ

